# РЭФЕРАТ

Справаздача 133 с., 1 кн., 182 крын.

ПАФАС, ІНСТЫТУЦЫЯНАЛЬНЫ ДЫСКУРС, ПАЗІЦЫЯНІРАВАННЕ, САЦЫЯЛЬНАЯ ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ, СТРАТЭГІЯ МАЎЛЕННЯ, ЭТАС

Аб’ект даследавання – катэгорыя пафасу, праяўленая ў мастацкіх і публіцыстычных беларускамоўных тэкстах.

Прадмет даследавання – дыскурсіўныя адзінкі беларускага маўлення, якія атрымліваюць пафасны кампанент.

Мэта – лінгвапрагматычнае даследаванне пафасу беларускага маўлення.

У працы выкарыстаны метад структурна-семантычнага аналізу – моўныя формы аналізуюцца як адзінкі лексіка-фразеалагічнай сістэмы мовы з улікам спецыфікі і абставін іх ужывання ў маўленчай сінтагматыцы.

Навуковая навізна выкананага даследавання заключаецца ў паслядоўным выкарыстанні інстытуцыянальнай тэорыі і інстытуцыянальнай тэрміналогіі ў лінгвістычным даследаванні форм і стратэгій выражэння пафасу ў розных тыпах беларускамоўнага дыскурсу.

У выніку даследавання ўпершыню створана інстытуцыянальная парадыгма рэпрэзентацыі катэгорыі пафасу ў беларускім маўленні.

Ступень ўкаранення – вынікі даследавання ўкаранены ў вучэбны працэс псіхолага-педагагічнага факультэта.

Вынікі даследавання знойдуць шырокае прымяненне ў дальнейшай распрацоўцы моўнай прагматыкі і тэорыі маўленчых актаў, могуць быць выкарыстаны ў выкладанні лінгвістычных дысцыплін у ВНУ. Выкананае даследаванне арыентавана на ўдасканаленне дыскурсіўнай практыкі выкладання і дасягнення якасці пры навучэнні студэнтаў рознатыпным жанрам нерэфлекторнага маўлення.